Цана асобнага нумару 20 гр.

Opłatę pocztową uiszczono ryczałtem.

З[illegible]А ПРАЦЫ

Выходзіць два разы у тыдзень.

Адрэс [illegible] і Адміністрацыі: Вільня, Віленская вул. 12—6 (Wileńska 12. m. 6) Рэдакцыя адчынена ад 12 да 2 гадз. штодня, апрача сьвяточных дзён. Адміністр. ад 9 да 3.	Падпіска на адзін месяц з дастаўкай да хаты 1 зл. 50 гр., на 3 мес. — 4 зл., на паўгоду — 8 зл., на год — 15 зл., заграніцу ўдвая даражэй. Перамена адрэсу 30 гр.	Няпрынятыя ў друк рукапісы назад не вяртаюцца. Аплата надрукаван: залежыць ад Рэдакцыі.	Цана абвестак: перад тэкстам 25 грош., сярод тэксту 20 грошы і на 4 стр. 15 грош. за радок пэтыту ў 1 шпальту.

№ 6 — Вільня, Серада 20-га чэрвеня 1928 г. — Год 1

Бібліятэкі-чытальні на вёсцы.

„Вучыся, нябожа, вучэньне паможа змагацца з нядоляй, з няволяй!“—кажа наша вялікі пясьняр Янка Купала.

Гэтыя некалькі слоў надзвычай яскрава гавораць нам аб тым, што прычынай нашага вечнага стагнаньня пад уціскам пануючай клясы, прычынай таго, што капіталіст, ці абшарнік жыруе з нашай крывавай працы—ёсьць цемра, неасьвечанасьць.

Толькі тады, калі мы гэтую цемру выжанем з вёскі прэч, калі пад нашую бедную страху загляне сонца навукі, толькі тады мы здолеем змагацца за лепшую будучыню, толькі тады лягчэй будзе скінуць з сябе жалезныя ланцугі, якія апутваюць нас з ног да галавы.

З гэтых некалькіх радкоў ясна, як дзень, якое вялікае значэньне навукі ў вызваленьні працоўнага народу.

Навука — гэта той магутны молат, пры помачы якога працоўным масам зусім лёгка разьбіць путы адвечнай няволі.

Аднак, што-ж мы бачым у сучаснай загнанай беларускай вёсцы?

Перадусім, поўная адсутнасьць родных школаў, дзе-б маглі здабываць сялянскія дзеці навуку ў роднай мове. Поўная адсутнасьць тых крыніцаў, скуль бяруць пачатак сьветлыя касулі, нясучыя праўду пад старую, мохам зарослую страху нявольніка-селяніна. Глянуўшы ў сучасны мамэнт на працоўную вёску, убачым там сумныя, хапаючыя за сэрца малюнкі. Стаіць чужая, у незразумелай для сялянскіх дзяцей мове, школа, дзе вучацца толькі па неабходнасьці, з-то пад прымусам. А то найбольш вучацца там сыны асаднікаў ды другіх паноў, прыехаўшых з нейкай Пазнані.

Для дзяцей працоўных Беларусі шлях да навукі застаўлены рознымі перашкодамі.

Ня гледзячы на дзесяткі тысячаў дэкляварацыяў, якія штогод складаюць працоўныя гушчы Беларусі з дамаганьнямі школы ў роднай мове, дамаганьні застаюцца крыкамі ў пустыні. Нішто не памагае.

Дзеці працоўнага народу заставайцеся, як хочаце.

Прадаўжайце цягнуць лямку сваіх бацькоў!

Аднак, нашы думкі, думкі працоўнай моладзі, павінны быць іншымі. Мы не павінны заставацца пад тым, што нам не даюць магчымасьці здабыць хоць мінімум асьветы, хоць мінімум таго, што запраўды неабходна чалавеку. Мы мусім усе сілы палажыць для яе здабыцьця, мусім разбурыць усялякія перашкоды. Якім-жа спосабам здабыць навуку, ня маючы школы? Вось тут як-раз аграмадную ролю адыгрывае *самаадукацыя, самаразьвіцьцё*. А на вёсцы самаадукоўвацца магчыма толькі і толькі праз чытаньне кніжак. Чалавек, чытаючы добрыя кніжкі, разьвіваецца ўва ўсіх галінах веды. Ен знаёміцца з прыродай, з гісторыяй, з географіяй, з астраноміяй і інш. Ен знаёміцца з тым, як праз усю гісторыю ідзе змаганьне эксплёатаваных з эксплёататарамі. Кніжка вучыць чалавека, як трэба жыць, як адносіцца да іншых народаў і да сваіх суседзяў. Добрая кніжка паказвае яму, дзе ёсьць праўда, а дзе зло і як з апошнім змагацца. Кніжка паказвае чалавеку, дзе бакі дадатнія, а дзе ад'емныя і шмат чаго іншага.

Наагул, чытаць добрую кніжку — гэта ўсёроўна, што гутарыць з разумным чалавекам — вё аўтарам, які выкажуў усе свае думкі, усе настроі.

Як прыклад таго, што кніжка прыносіць шмат карысьці, могуць служыць нашы вялікія пісьменьнікі Цішка Гартны, Алесь Гарун і інш., якія па прычыне цяжкага матэр'яльнага стану, не маглі навет скончыць вясковых школаў, а між тым, дзякуючы шматлікаму і разумнаму чытаньню кніжак, сталіся вялікімі людзьмі ў адраджэньні працоўнага народу.

З усяго сказанага бачым, што карысьць ад разумнага чытаньня кніжак аграмадная.

Значыцца, каб здабыць навуку самаадукацыяй *трэба чытаць і чытаць кніжкі*.

Дзе-ж іх узяць? — мімаволі насоўваецца пытаньне. Адказ на яго аднак зусім просты. Каб мець магчымасьць чытаць кніжкі, *на вёсках трэба абавязкава закладаць бібліятэкі-чытальні*, дзе-б працоўная моладзь магла браць іх у кожны час.

Не павінна быць ніводнага Г-ка Т-ва Бел. Школы бяз бібліятэкі-чытальні. Бібліятэка на вёсцы бяз роднай школы гэта і будзе для сялянскай моладзі той крыніцай, скуль яна мусіць браць сваю веду, сваю адукацыю, якая так неабходна ў сучасны момант для вызваленьня беларускіх працоўных гушчаў.

Перадусім *моладзь павінна ўзяцца за гэтую справу*.

Дык да працы, сябры!

Італьянска-англійскі націск на Югаславію і яе—капітуляцыя.

Як можна лёгка зразумець новы выбух італьянска-югаслаўскага канфлікту, захапіўшага ўжо, апрача кіруючых вярхоў, і заражаныя імі атрутай узаемнай ненавісьці шырокія масы народаў з абодвух бакоў, умысна справакаваны фашыстамі і Мусоліні ў зусім ясных і выразных мэтах.

Мусоліні хоча цяпер-жа за ўсялякую цану—змусіць Югаславію ратыфікаваць (зацьвердзіць у парляманьце) так званы „Трактат у Нэттуно“.

Трактат гэты падпісаны дыплёматамі абодвух краёў яшчэ за тры гады таму назад, але не ратыфікаваны дагэтуль дзеля таго, што Мусоліні—пасьля падпісаньня Трактату, устанаўліваючага стасункі ўзаемнага даверыя і добра-суседзкай прыязьні паміж абодвума краямі—дзеля раўнавагі іх уплываў на Балканах—зараз-жа зламаў гэтую раўнавагу і гэтае даверые, падпісаўшы тайком ад Югаславіі знамяніты „Трактат у Тырано“ з Альбаніяй, які фактычна аддаў гэты безгаловы, паўдзікі край пад поўнае панаваньне Італіі. Пасьля гэтага спрытнага „фокусу“ фашыста Мусоліні — зараз-жа выйшаў у адстаўку той міністар загранічных справаў Югаславіі Нінчыч, які сваю палітыку апіраў на „сэрдэчным паразуменьні з Італіяй“, працуючы дзеля „цеснага збліжэньня“ з ей. Новы міністар Марынкавіч пачаў з рашучай заявы, што—„пасьля Трактату ў Тырано—ня можа быць трактату ў Нэттуно“.

Альбанскі захват Мусоліні і распачаў той вострыі цяжкі канфлікт між Італіяй і Югаславіяй, які залішне глыбака пасеяў на Балканах новае насеньне ненавісьці, каб яно раней ці пазьней ня ўзышло крывавай руньню вайны...

Цяпер Італія, маючы ўсе казыры значнай ваеннай перавагі ў сваіх руках, маючы захваченую „гвалтам спрыту“ Альбанію, маючы падтрыманьне з боку магутнай палітычна і фінансава Англіі, усьцяж рыхтуючыся да вайны, каб мілітарна замацаваць свае „дыплёматычныя пасьпехі“ на Балканах, зьвяртаецца да Югаславіі з дамаганьнем... „ўзнаўленьня нармальных стасункаў прыязьні“, адначасна зьвяртаючыся да „сусьветнай апініі“—з скаргай на—„ўпорнасьць і ваяўнічасьць Югаславіі, пагражаючую эўрапэйскаму супакою“... Абраз — такі характэрны ў нашыя часы ў „мірнай“ Эўропе—для стасункаў дзьвюх дзяржаваў значна няроўнай сілы...

Італія—пад пагрозай вайны—трэбуе ад Югаславіі ратыфікацыі таго самага Трактату ў Нэттуно, які Мусоліні зламаў у яго найістотнейшым зьмесьце і найважнейшай вартасьці для Югаславіі.

Што значыць для абедзьвюх старонаў зацьверджаньне Югаславіяй гэтага трактату—ясна кожнаму.—Для Югаславіі ратыфікацыя трактату азначае прызнаньне дакананага Мусоліні гвалту, ці—адмову ад усялякіх прэтэнзыяў і ўплываў у Альбаніі.

Для Італіі гэта ратыфікацыя з боку Югаславіі... мусоліняўскага захвату Альбаніі запраўды-ж найлепш завяршае ды замацоўвае дакананы захват і адначасна — разьвязвае рукі для далейшых „пасьпехаў на Балканах“. Ратыфікацыя Трактату ў Нэттуно Югаславіяй зьявілася-б запраўдным трыумфам італьянскай „мірнай палітыкі на Балканах“—бо без вайны пакідала-б у руках Італіі Альбанію. Гэта была-б запраўдная капітуляцыя Югаславіі перад Італіяй, якая пэўне-ж паслужыла-б толькі мастом ды пабудам для далейшых крокаў „італьянскай экспансыі“ на Бальканах—коштам Югаславіі.

Усю гэтую сваю ваенна-захватніцкую палітыку Мусоліні спрытна прыбраў у пекныя пацыфістычныя рызы, здабыўшы дзеля гэтага такога мастака „пацыфістычнага („міратворчага“) красамоўства“, хаваючага за сьпінаю браніраваны кулак зачэпнага імпэрыялізму,—як сам п. Чэмбэрлен.

Мусоліні кажа, што—ратыфікацыяй трактату Югаславія найлепш давядзе ўсяму сьвету, што ня хоча вайны з Італяй... „Калі-ж не, калі Югаславія яўна адмаўляецца ад прыязных, добра-суседзкіх стасункаў з Італіяй, дык тады хай прынамсі ўся Эўропа ведае, хто хоча ў ей распаліць полымя пажару“.

—·—

І вось гэтая „Эўропа“, а перадусім яе „найвялікшая вялікая дзяржава“—фінансавы капітал—якая заўсёды падтрымлівае... „справядлівасьць мацнейшай стараны“ ўва ўсіх міжнародных канфліктах, пачала націскаць на Югаславію, каб тая пагадзіліся з Італіяй — „ў інтарэсах эўрапэйскага супакою“... Націск гэты, ведама-ж, лёгка раздушыў апор ураду. Але за ўрадам Югаславіі стаіць яе парлямант, ад якога залежыць ратыфікацыя. Парляманту загадываць ужо значна цяжэй. А ў гэтым парляманьце ёсьць востра-варожая сучаснаму ўраду апазіцыя, якая мае ўжо шмат сваіх унутраных „рахункаў“ з урадам. Апроч таго, — апазіцыя гэта складаецца ў пераважнай частцы з харватаў і славенцаў, якія ў дадатку асабліва ненавідзяць Італію з яе фашыстаўскім ўрадам—за тыя бязупынныя гвалты, якія італьянская ўлада тасуе, як сыстэму панаваньня, у падараваных Італіі саюзьнікамі добрых шматах зямлі—з чыста харвацкім і славенскім насяленьнем...

З гэтага ясна, якое цяжкае палажэньне стварылася для югаслаўскага ўраду ў парляманьце, да якога ўрад—пад ваенна-фінансавым націскам звонку зьвярнуўся з прапазіцый зацьвердзіць Трактат у Нэттуно.

Калі, такім чынам, міністар Марынкавіч у канцы траўня выступіў урэшце ў парляманьце — з адказам на інтэрпэляцыі з боку апазіцыі, дык ён пусьціў у ход усе рэзэрвы свайго красамоўства, каб давесьці... канешнасьць, калі не карыснасьць для Югаславіі ратыфікацыі Трактату ў Нэттуно... Ен—ну ведама-ж—(такая ўжо роля міністра-дыплёмата!) — бажыўся пры гэтым, што на ўрад суверэннай Югаслаўскай дзяржавы няма ніякага націску—ані ваенна-палітычнага з боку Мусоліні, ані фінансавага з боку Англіі... Ен казаў, што справа англійскай пазыкі для Югаславіі вырашана ў Лёндане — „зусім незалежна ад якіх-небудзь палітычных варункаў“... Хаця навет малое дзіця ведае цяпер, што ані воднага даляра, ці фунта не дае цяпер „найвялікшая дзяржава сьвету“ — фінансавы капітал — без такіх ці іншых палітычных варункаў, часам ламаючых крута ўсю папярэднюю палітыку бяручай пазыку дзяржавы, часта—з яўнай шкодай для палітычных інтарэсаў апошняй.

Якую праўду казаў міністар - дыплёмат свайму парляманту, а праз яго — свайму краю, аб гэтым выразна кажа загранічная прэса, дый увесь ход канфлікту.

У той самы час, калі мін. Марынкавіч бажыўся ў Скупштіне (так завецца югаслаўскі парлямант), што з боку англійскага капіталу няма ніякага палітычнага націску на Югаславію, уся італьянская прэса горача ды ўдзячна выхваляла банкіраў прыязнай да Італіі Англіі—за тое, што яны „рашуча адмовіліся выплаціць грошы, прыехаўшаму ў Лёндан для канчальнага падпісаньня пазыкі югаслаўскаму міністру фінансаў, пакуль ня будзе ратыфікаваны трактат у Нэттуно“... Другую „дыплёматычную праўду“ мін. Марынкавіча — што ня было націску з боку Італіі—няменш выразна зьвальвае такі добра інфармаваны „орган міжнароднай апініі“, якім зьяўляецца „Журналь дэ Жэнэв“ — афіцыёз Лігі Нацыяў.

У № за 31 траўня газэта гэта зьмяшчае артыкул, у якім кажа, што — „вельмі сумна глядзіць на палажэньне, створанае завастрэньнем канфлікту Італіі з Югаславіяй“. „Але, калі-б югаслаўскі ўрад не правёў ратыфікацыі трактату з Італіяй, трэба было-б спадзявацца далейшага завастрэньня (!) агульнага палажэньня ў Эўропе. Першым чынам — у выніку адмовы з боку Югаславіі—італьянскі ўрад адмовіцца ўзнавіць трактат прыязьні з Югаславіяй, падпісаны ў 1924 г.“... А гэта значыць—амаль не парве з ёй дыпляматычныя стасункі!.. Ня шмат трэба спрыту, каб зразумець, што гэты артыкул органу Лігі Нацыяў, якая зьяўляецца зручным прыладам для панаваньня вялікіх дзяржаваў над малымі, напісаны, ці, як дэлікатна ды туманна кажуць, „іньсьпіраваны“ італьянскім урадам, каб перад міжнароднай апініяй перакласьці ўсю віну за „завастрэньне агульнага палажэньня ў Эўропе“ з Італіі на Югаславію, — з мацнейшага захватчыка на слабейшага, пакрыўджанага...

З гэтага ўсяго — ясна, як асьцярожна трэба верыць усім афіцыяльным заявам дыплёматаў, навет у парлямантах, перад тварам народных прадстаўнікоў. Бо ж ці можа які міністар заграничных справаў прызнаць публічна, з парляманцкай трыбуны, што яго ўрад прыняў тую ці іншую пастанову—пад націскам звонку...

Як бы ні было, югаслаўскі парлямант урадавай большасьцяй прызнаў тлумачэньні міністра—у адказ на інтэрпэляцыю апазіцыі—задаваляючымі! Гэта — знак, што трактат у Нэттуно будзе ратыфікаваны. Але, як высьвятляецца, урад будзе мець яшчэ шмат клапотаў з апазіцыяй, якая пастанавіла за ўсякую цану дый усялякімі спосабамі, ня выключаючы найвастрэйшых спосабаў „чыннай абструкцыі“ (спраціву),—перашкаджаць легалізацыі акту італьянскага гвалту ды подступу на Балканах, падчырківаючы ў гэтым перад краем — страшэнную небясьпеку для вольнага нацыянальнага разьвіцьця славянства на Балканах — з боку „новых аўстрыякаў“ — італьянскіх фашыстаў, ня кажучы ўжо — аб паняволеньні гэтых пераважна земляробскіх сялянскіх краёў італьянскім прамысловым капіталам.

Як бачым, апазіцыя мае гарачыя, блізкія сэрцу народных масаў сялянскага разнанацыянальнага краю, лёзунгі барацьбы з урадам, б'ючы ўрад і ўласнымі нядаўнімі законамі яго-ж міністраў. Такім чынам, навет, калі ўрад здабудзе перамогу і правядзе праз парлямант трактат у Нэттуно, дык гэтая „перамога ўраду“, зьяўляючаяся адначасна капітуляцыяй дзяржавы перад яе ворагам — Італіяй, можа аказацца для ўраду фатальнай: можа зваліць урад дый даць уладу апазіцыі. Да гэтага наагул недалёка ўжо ў апошнія часы ў Югаславіі. А падыход да ўлады апазіцыі, якая складаецца ў значнай меры з харватаў і славенцаў, азначаў-бы—грунтоўную перабудову ўсяго дзяржаўнага ладу „Сэрба-Харвата-Славянскага Каралеўства“—у кірунку запраўднай фэдэрацыі гэтых краёў і народаў—на правох роўнасьці і волі—у замену цяперашняга панаваньня сэрбскага нацыяналізму ды цэнтралізму!

Грамадзяне! Памажэце пагарэльцам!

Вёска Скіпоравічы, Казлоўскае воласьці перад сьвятамі, а вёска Акунінава, Дзявяткаўскае воласьці ўжо пасьля сьвят знішчаны пажарам. Пажары былі такія страшныя, што навет ёсьць і людзкія ахвяры.

Дык грамадзяне! памажэце сваім няшчасным братам! Ня дайце іх дзеткам распаўзьціся з торбамі па сьвету! Складайце ахвяры, хто чым можа, і адвозьце пацярпеўшым. Гурткі Т-ва павінны ў найбліжэйшым часе паставіць па аднаму спэктаклю на карысьць пагарэльцаў, даход ад якога можна пераслаць і праз Акружную Управу.

Слонімская Акружная Управа.

Слонім, Ражанская 55.

Працэс Белар. Сялян.-Работн. Грамады.

Ад Абрамовіч. Абв. Мятле, б. нар. вучыцелю, закідваецца русыфікатарства. Гэта няслушны закід і ён не павінен быў знаходзіцца ў акце абвінавачаньня. Ды і на падставе яго ня можна абвіняць па 102 арт. Пасьля абв. Мятла быў скарбнікам легальнае Грамады. Але-ж ці з гэтага поваду можна рабіць закід з арт. 102?

Пераходжу да закіду прыгатаўленьня паўстаньня. Закід гэта маюць пацьвердзіць дзьве прамовы Мятлы на сабраньнях у днях 10 і 11. I. 26 г. Трудна верыць сьведку, які беспасярэдна прамовы ня чуў. Сьведка, пал. Майхровіч, чуў аб гэтым ад іншых. Але гэтыя іншыя сьведкі, як Капуста, Рагоўскі, запярэчылі, быццам Мятла заклікаў да паўстаньня. Канфідэнт-жа, пал. Скалацкі, паказаў, што ў судзьдзі сьледчага сцьвярдзіў, быццам Мятла заклікаў да паўстаньня дзеля таго, што яму гэтак паказываць загадаў кам. пал. Майхровіч. Адвадовыя-ж сьведкі сцьвердзілі, што 10 і 11. I. 26 г. былі ў Мятлы па розных справах і там ніякага сабраньня ня было.

Што-ж датычыцца арганізацыі „bojówek", дык паводле сьведак з боку абвіненьня камандзірам іх меўся быць Смабіла, чалавек без нагі, 100% інвалід... Быў тут, паны судзьдзі, сьв. Глушын, сьведка характэрны, які некалькі разоў замянаў свае паказаньні. Калі паказваў у судзьдзі сьледчага, меў перад сабой працэс, лічыў, што паказаньні яго адаб'юцца на працэсе і дзеля гэтага сказаў, што падчас 5 мінутнай гутаркі Мятла загадаў яму, якога першы раз бачыў, сабіраць аружжа. Зьмяніў свае паказаньні, калі быў засуджаны. Пасьля ізноў іх пацьвярдзіў. Ці-ж можна гэткаму сьведку верыць, які столькі разоў ілгаў? Гэты-ж самы Глушын быў канфідэнтам паліцыі. Паліцыянты-ж Здановіч і Кубарскі апіраліся на наказаньнях Глушына. Камэнтарам да гэткага роду сьведак можа служыць пратакол гуртка з антыдзяржаўнымі пастановамі. Пратакол падпісаў сам Глушын... Канфідэнты Глушын і Ласёнак зьяўляюцца галоўнымі арганізатарамі гурткаў і пасьля інфармуюць паліцыю. Паны судзьдзі, калі аб гэтым кажу, дык прыходзяць мне на мысьль панурыя часы Азэфа. Доказы ня могуць апірацца на дамыслах і прыпушчэньнях.

Закідваецца, апрача гэтага, дзеяльнасьць амнистыйная. Я ня бачу ў гэтым нічога карагоднага. Есьць рэччу агульна вядомай, што дзеяльнасьць гэткая вядзецца зусім яўна. Даволі ўспомніць дзеяльнасьць п. Сэмплоўскае.

Ніякіх доказаў віны ня знойдзена і проціў абв. **Драгуна**, знойдзена ў яго стрэльбу, аб якой экспэрт сказаў, што з яе ня можна страляць. Знойдзена набоі, паходзячыя з часоў інвазіі. Адносна **абв. Беламызага** ёсьць закід, быццам ён быў на нейкім сабраньні пры заслоненых вокнах. Прыпушчаецца, што сабраньне было нелегальнае. Гэта-ж ня доказы, гэта толькі дамыслы і прыпушчэньні.

Паны судзьдзі, сяньняшняя справа прыпамінае мне іншую справу. Прыпамінаюцца мне рэпрэсіі ў адносінах да літоўскага грамадзянства некалькі год назад. І тады таксама казалася аб паўстаньні і паразуменьні з суседняй дзяржавай. І ў рэзультаце праф. М. Біржышка, які хацеў быць праф. на У. С. Б. астаўся рэктарам унівэрсытэту ў Коўні. І тут ёсьць аналёгія. Тарашкевіч, які павінен быць праф. У. С. Б., можа астацца рэктарам унівэрсытэту ў Мінску. Хто на гэтым страціць? Страціць Польшча.

Мы павінны імкнуцца да згоднага ўкладу адносінаў у нашым краю, не адпіхаць і адкідаць, але прыцягаваць. Мы, гутарачыя ці то па-польску, беларуску, ці па-літаўску (бо няма мовы „тутэйшае", як кажа пракурор), павінны аздаравіць душную атмасфэру, якая вытварылася па рэпрэсіях у адносінах да Беларусаў і Літоўцаў.

У імя дабра Польшчы, нашага краю, прашу абвінавачаных апраўдаць!

З Сойму.

З прычыны частай канфіскаты нашай часопісі, ня можам падаць паважаным чытачом больш-менш падрабязнай справаздачы з Сойму, а мусім абмяжавацца як найкарацейшым аглядам соймавай „працы".

На 16-м паседжаньні Сойм разглядзеў 6 галінаў бюджэту і прыступіў да 7. Найбольш часу забрала дыскусія над бюджэтам асьветы і рэлігіяў.

Але і ў такой пасьпешнай і вельмі паверхоўнай „малацьбе" бюджэту не абышлося без асабістых „інцыдэнтаў", аб якіх пачаў сам марш. Сойму сваім Саламонавым судом, забясьпечваючым канфлікты паміж прамоўцамі і іх партыямі.

Бяз дыскусіі Сойм прыняў наступныя бюджэты: Прэзыдэнта Рэспублікі, Сойму, Сэнату і Найвышэйшай Кантрольнай „Izby".

У канцы паседжаньня маршалак паведаміў аб атрыманьні пратэстацыйнай тэлеграмы ад пасла Стагановіча (Б.С.-Р.П. Клюбу), заяўляючы (вельмі характэрна для лідэра рэпэсаў), што гэта—адзін з лёгічных вынікаў выдача паслоў судом.

17 паседжаньне зазначылася некалькімі цікавымі хвілінамі, асабліва ў дыскусіі над бюджэтам Мініст. Унутраных Спраў.

Першай сэнсацыяй была заява пасла Сабалеўскага (кансэрватар з Б. Б.), што „зьмена канстытуцыі мусіць быць праведзена з Соймам, або бяз Сойму. Наступна цэлы рад паслоў („з лявіцы") атакавалі дзяржаўную адміністрацыю за выбарныя надужыцьці.

Гэтае паседжаньне было для староньнікаў ураду вельмі непамысным.

На пачатку 18 паседжаньня Сойм адаслаў у камісію бяз дыскусіі закон („уставу") ў справе экстрадыцыйнага трактату (выдаваньня праступнікаў).

У дыскусіі над бюджэтам мініст. камунікацыі, справаздаўца, пас. **Качароўскі**, гаворыць, што жал. дарога штогодна даплачвае да вывазу вугля (вуглявым „баранам") больш 17 мільёнаў злотых, ня лічачы некалькіх дзесяткаў мільёнаў страчанага даходу, які быў-бы пры нармальных тарыфах.

На 19 паседжаньні, па кароткіх, ня маючых у сабе нічога асаблівага дыскусіях, Сойм прыступіў да разгляду экстранага ўнёску Белар. Сял. Раб. Пас. Клюбу ў справе ўстрыманьня судовай расправы проці паслоў — (з гэтага клюбу) **Стагановіча і Грэцкага**.

Экстранасьць унёску бараніў пас. д-р. Дварчанін (прамова пададзена ў пап. нумары).

На 20 паседжаньні Сойм разглядзеў бюджэт Міністэрства Прамыслу і Гандлю, Поштаў, Тэлеграфаў і Публічных Работаў.

На 21 паседжаньні было не бяз цікавых мамэнтаў. Справаздаўца бюджэту Ваеннага Міністэрства **пас. Касьцякоўскі** (Б.Б.) заяўляе, што сёлетні бюджэт Ваеннага Міністэрства невялікі — толькі 730 мільёнаў(!) і пратэстуе проці зьмяншэньня ліку арміі.

Пас. Пэроцкі (ББ) выступае проці зьмяншэньня часу службы ў войску.

Пас. Лібэрман нарысоўвае ваенныя небясьпекі для Польшчы з боку Нямеччыны і Радаў. Аб Радах дадае, што там вельмі разбудованы газаўніцтва і лятацтва, а ў 1935 годзе, кажа, Рады будуць мець 9 мільёнаў людзей гатовых ваяваць.

У дыскусіі над бюджэтам Міністэрства Справядлівасьці пас. **Трампчынскі** вельмі востра скрытыкаваў палітыку сучаснага Ураду.

Прамова яго выклікала гарачыя пратэсты і абурэньне з боку ўраду і яго староньнікаў і зьдзівіла ўвесь Сойм.

У далейшай дыскусіі над бюджэтам Мін. Справядлівасьці (на наступным 22 паседжаньні) прамаўляў пас. **Валынец**, які выказваўся за скасаваньне бюджэту. Прамову яго, падамо ў наступным нумары.

Далей Сойм разглядзеў бюджэт Мін. Скарбу, Эмэрытураў і Рэнты.

Гэтым закончаны разгляд 1 часткі дзяржаўнага бюджэту на 1928—29 бюджэтны год.

Як бачым, у гэтай дыскусіі зачэплена многа пытаньняў — некаторыя навет вельмі важныя, — але з пасьпеху Сойм не разглядзеў ні аднаго з іх, як належыць, дзякуючы чаму ад гэтай вялікай дыскусіі атрымліваецца незразумелае, пярэстае ўражаньне, чыстай фармальнасьці, з найбольш рэльефнымі палітычнымі мамэнтамі.

А на тое, што мо' гэтая фармальнасьць можа калі зьменшыцца няма, дый ня можа быць, ніякай надзеі.

Вынікі галасаваньня над 2 часткай бюджэту.

На 23 паседжаньні (13 г. м.) Сойм прыступіў да галасаваньня над бюджэтам.

Бяз зьмен прыняты наступныя бюджэты: **Прэзыдэнта Рэспублікі, Вярхоўнай Кантрольнай Палаты** (Najw. Izby Kontroli) і **Прэзыдыума Рады Міністраў**. Усе прапазіцыі аб зьменах ў гэтых галінах бюджэту, паддзержываныя ББ, праваліліся.

Бюджэт **Мін. Заграгічных Спраў** прыняты ў фармуліроўцы камісіі.

Бюджэт Ваеннага Міністэрства зьменшаны на 572,193 злоты.

Бюджэт **мін. Унутраных Спраў** прыняты з 2 папраўкамі, якімі скасоўваецца з бюджэту на Паліцыю 870,000 злотых. Папраўка ўраду, аб далучэньні 6,000,000 злотых у распараджэньне гэтага М-ва, адкінута ўсімі проці ББ.

Бюджэт **М-ва Скарбу** прынята з 3 папраўкамі, папраўка **Дыяманда** (ППС) і **Карнецкага** ZZN, аб павялічэньні на 30 мільёнаў даходу з акцызу (cel), і 2 папраўкамі пас. **Марка** (ППС) аб павялічэньні па 20 мільёнаў даходу з тытуновага і сьпіртовага манапаляў. 2 папраўкі ўраду—адкінуты.

Бюджэт **М-ва Справядлівасьці** прыняты з урадавай папраўкай, аб звароце асыгнаты 100,000 злотых на выканаўчыя работы М-ва.

Другая-ж урадавая папраўка, аб звароце скрэсьленых 10 злотых на выдавецтва М-ва,—дэманстрацыйна адкінута за тое, што „Dziennik Ustaw" не надрукаваў аб скасаваньні Соймам урадавага прэсавага дэкрэту.

Бюджэты **М-ваў Прамыслу і Гандлю, Земляробства (Rolnictwa), Рэлігій і Асьветы**, прыняты з маленькімі папраўкамі, адкідаючы ўрадавыя папраўкі.

Бюджэты М-ваў **Камунікацыі, Зямельных Рэформаў і Публічных Работаў** таксама прыняты з нязначнымі папраўкамі.

Бюджэт М-ва **Поштаў** прыняты з папраўкай, касуючай 1 злот, у пазыцыі на закуп акцыі „П. А. S." Т-ы. Папраўка прайшла 244 галасамі проці 147 (ББ і Вызв.). Па абвяшчэньні выніку галасаваньня раздаліся воплескі.

Як відна, дык гэтае галасаваньне дало мінімальныя цыфравыя зьмены ў параўнаньні з пастановамі камісіяў. Гэта мае вялікі палітычны характар, бо ясна паказвае, што Урад, апрача ББ, быццам ня мае падтрыманьня ў Сойме (?!), бо-ж усе ўрадавыя ўнёскі былі адкінуты, а прыняты праціўныя ім і навет „дэманстрацыйныя"—як скасаваньне 10 зл. на дзяржаўнае выдавецтва і 1 злот у М-ве Пошчы, як знак пратэсту проці „лічніковых" тэлеграфічных аплатаў.

Трэбуйце адказу.

Да грамадзян і паўнамоцнікаў, склаўшых дэкларацыі на ўрадавыя беларускія школы на 1928/29 школьны год.

У сувязі з распараджэньнем міністра Рэлігійных Спраў і Публічнае Асьветы з 7/I. 1925 г. на падставе ўставу аб арганізацыі беларускага школьніцтва з 31/VII. 1924 г., школьны інспэктар, разглядзеўшы дэкларацыі не **пазьней 31 траўня** (мая), робіць сваё заключэньне і з усімі матар'яламі справу перадае Куратару. На падставе дадзеных інспэктарам прапазіцый куратар **у працягу месяца** рашае аб мовах навучаньня ў тэй ці іншай школе і аб сваім рашэньні праз абвестку **паведамляе заінтарэсаваную людласьць**. Апроч таго, аб сваім рашэньні Куратар паведамляе аднаго з тых бацькоў, якія жадаюць навучаньня сваіх дзяцей у беларускай мове, і аднаго з тых, якія жадаюць навучаньня сваіх дзяцей у польскай мове.

Пастанову Куратара бацькі могуць абжалаваць да Міністра Асьветы ў працягу 14 дзён ад дня паведамленьня праз абвестку.

Усе грамадзяне і паўнамоцнікі школьных абводаў, склаўшыя дэкларацыі на ўрадовую беларускую школу на 1928/29 школьны год, павінны **дамагацца праз школьных інспэктараў пастаноў Куратара** (калі Куратар сам не паведаміў) у справе арганізацыі беларускіх урадовых школаў на 1928/29 шк. год.

Пажадана было-б, каб паўнамоцнікі школьных абводаў, а там, гдзе паўнамоцнікаў няма, то бацькі ў ліку двох **даведаліся-б** у вышэйсказанай справе ў **мяйсцовага школьнага інспэктара асабіста**, але калі значная адлегласьць школьных абводаў ад мяйсцовых школьных інспэктараў гэтаму перашкаджала-б, то хай зварочваюцца **пісьменна** (заказнымі пісьмамі) з цьвёрдым дамаганьнем пастановы Куратара ў справе адчыненьня беларускіх урадавых школаў на 1928/29 шк. год.

Увага: Пад словамі: „школьны абвод" разумеецца адна вёска або некалькі, якія адносяцца да тэй ці іншай школы.

Галоўная Управа
Т-ва Беларускае Школы

Ці Вы прыдбалі хоць аднаго платнага падпішчыка для нашай газэты?

Чытайце і пашырайце сваю сялянска-работніцкую газэту.

Сяляне і работнікі!

Памятайце, што кожнае слова Вашае газэты Вас усьведамляе, а кожны Ваш грош запэўняе ей існаваньне.

Воля і доля сялян - бедякоў.

(Працяг).

Нарада.

За тыдзень перад сходам, на які павінны былі прыйсьці выбраныя ад вёсак людзі, Дзяцел у сваім пакою сабраў старастаў і верных сабе людзей на нараду. Усе ўжо трохі падпілі і глядзелі на „пана" старшыню пасалавеўшымі вачыма.

— Ну, як, мальцы, — зьвярнуўся да іх старшыня,—што ў вас добрага чуваць? Каго мужыкі думаюць выбраць на старшыню?

— Чуваць кепскавата—адказаў староста Мілаўскай грамады — цябе, пане старшыня, усе вясковыя страшэнна ня любяць, хочуць выбраць Вяршылу з Дубнікаў: ён то ня надта гэтага хоча, кажа „я ўсё роўна доўга вам не праслужу", але супраць цябе падніме ўсю маю грамаду.

— А хто з ім яшчэ руку трымае?—запытаў у яго Дзяцел.

— Да яго часта прыходзяць чытаць газэты Антось Пірог з іхняй вёскі, Зьмітрок з Падгорнай ды Язэп Бандар з Крывасельля; гэта адзін дух з ім.

— „Прашу запісаць"! зьвярнуўся да пісара старшыня—я аб іх пагавару са станавым, ён знойдзе якую прычэпку ды пасадзіць хоць на час выбараў.

— „Есьць"! адказаў той, падміргнуўшы вокам.

— А ў цябе як? — запытаў у старасты Вянеўскай грамады.

— У мяне найбольш бунтуюць Асінаўцы і ў іншых ёсьць па чалавечку.

— „Ідзі сюды, бліжэй"! прыказаў яму старшыня—скажы іх прозьвішчы пану пісару! Я іх назначу на той дзень ў падводы, а калі-б і не хацелі ехаць, дык, дзеля пэўнасьці, пашлю туды стражніка.

Староста пачаў пералічваць:—Астапчык Сымон, Бадрак Грогор, Карыта... а пісар толькі скрыпеў пяром, запісваючы „бунтаўшчыкоў".

— А мне што з імі рабіць? — запытаў у старшыні староста Цялеўскай грамады.

— Табе?—Твая грамада далёка ад гміны, самі яны не даведаюцца, а ты аб'яві ім, што сход ня 17-га, а 18-га. Ха-ха-ха!—зарагатаў Дзяцел:—няхай прыходзяць на заўтра! Нашым скажам праўду!

Староста спусьціў удол вочы і, падумаўшы, адказаў.

— Як даведаюцца—будуць лаяць, а могуць яшчэ і па карку надаваць.

— „Ня бойся"!—падбадзёрваў яго старшыня, — няхай папрабуюць толькі! А калі будуць лаяць—дык скажаш, што абмыліўся.

— Наагул, мальцы,—зьвярнуўся да ўсіх прысутных Дзяцел—старайцеся, каб папрыходзілі толькі нашы людзі; хай яны там па вёсках, дзеля адводу вачэй, брэшуць на мяне, як хочуць, я гневацца за гэта ня буду, а то інакш могуць ня трапіць на сходку. Скажэце, што я іх не забуду: і пазыку з гміннай касы атрымаюць, калі захочуць, і работы ім буду аддаваць на выгадных варунках, і ў падводы рэдка паедуць і ўсё такое. А вам, хлапцы,—сказаў ён, выймаючы з кішані партманэт, цяпераka дам па трыццатку рублёў на расход: падпаіце, каго трэба, а каму і сухой арэнды пятку дайце, калі мала будзе абяцанкі!

— Зашуршэлі сінія ды чырвоныя ў руках старшыні; усе па-чарзе бралі грошы.

— Табе дам пяцьдзесят—сказаў ён Мілаўскаму старасьце—бо твая больш бунтаўнічая грамада.

Усяго разьдзяліў больш двохсот рублёў. (Глупства! Крыніца-ж яшчэ ня высахла)!

— Нагаварыліся, аж у горле высахла, трэба, мусіць, было-б прамачыць, як вы думаеце? — жартаўліва запытаў Дзяцел сваіх кумпанаў.

— Трэба было-б! Не зашкодзіла-б!...—адазваліся яны.

— Ну, дык ідзеце да Шмэркі і загуляйце сабе добра. Я з вамі не магу быць, самі ведаеце, не выпадае — з вясковых можа хто ўбачыць. Шмэрка ведае аб гэтым і дасьць усё, што трэба.

— Нічога, і бяз пана старшыні там парадак павядзём! Дзякуем! — адазваліся некалькі галасоў.

— Старайцеся, мальцы, пакуль я буду старшынёй, то і вы за мной пажывяцё, ня скрыўджу!

— Добра! Пастараемся! Самі ведаем гэта!—дружна адказалі кумпаны і пачалі, сьпяшаючыся да Шмэркі, выхадзіць з пакою.

Сходка.

17-га, а гадзіне дзевятай пачалі сяляне па аднаму і невялічкімі грамадкамі сходзіцца да гміны. Віталіся. Усюды чулася трывожная гутарка.

— Чулі? Вяршылу-ж арыштавалі!

— Калі?

— Ды тры дні таму, яго дый яшчэ трох чалавек з ім захапілі!

— За-што?

— А хто іх там ведае,—кажуць, якіясь кніжкі знайшлі.

— Ай-яй, вось бяда!

— А ці можна яго будзе выбіраць на старшыню?

— Ня ведаю, мусіць можна!

— А калі ня можна, што тагды рабіць? Трэба, браткі, згаварыцца, на каго галасаваць, калі на яго не пазволяць!

— Што аб гэтым загадзя гаварыць, як усе зьбяруцца, тагды й згаворымся—гаварылі, пераміргіваючыся з некатарымі з сялян, агенты старшыні і пераводзілі гутарку на другую тэму.

— Ці чулі, што ў Міхееўцах мінулую ноч воўк каня зьеў?—гаварыў адзін.

— А ў Дуброўках на-днях дык укралі і каня і воз з упражай!—расказваў другі.

Усе, слухаючы, ахалі і распачалі гутарку аб ваўкох, а зладзеях, аб тым, што многа іх цяпер разьвялося ў нашай старонцы. Да дзесяцёх гадзін сабралася да двохсот чалавек. Часьць сядзела ў гміне, многія стаялі на двары, але тут і там круціліся сялянскія „прыяцелі" і ўсе баялі, што японец хоча ваяваць, Англія — зямлю ўзарваць, цар — міласьць пасланць, а сяляне, раззявіўшыся, слухалі, як тая варона з сырам у басьні Крылова.

Але вось з пакойчыку выйшаў пан земскі, пісар і важна селі за сталом; за імі ўвайшоў Дзяцел і то-ж сеў за кратамі, але ў старонцы на крэсьле.

— Сабірайся, сходка пачынаецца! — закрычэлі на дварэ.

Усе навалілі ў гміну: паўстаў шум, дзьверы скрыпелі бязупынку. Мінют пяць сэкрэтар з земскім нешта ціха гаварылі, потым пісар, стаўшы, закамандаваў:

— Цішэй! Сход аб'яўляецца адчыненым! Пан земскі хоча вам сказаць пару слоў.

Земскі падняўся з крэсла і, выставіўшы свае тоўстае бруха, загаманіў:

— Сяляне! Можаце выбіраць, каго хочаце, на старшыню, але я прапаную вам зацьвердзіць старага—пана Дзятла. Ен ужо прывык, службу спаўняе акуратна, кнігі ў яго ўпарадку — лепшага трудна вам будзе знайсьці. Назначайце кандыдатаў!

— Старага!! Дзятла!! — закрычэлі старшыновы староньнікі, якія таўпіліся наўперадзе ля кратаў.

— Вяршылу!!! — крыкнула большасьць прысутных.

— Вяршылу — паясьніў земскі — выбіраць ня можам, бо-ж ён арыштаваны, як процідзяржаўны праступнік і ня ведама, калі яшчэ выйдзе з турмы.

— Г-м... ня можна... Каго паставім? За каго галасаваць? — пачуліся шэпты на салі, але ўжо быў ня час згаварвацца.

— Назначайце яшчэ кандыдата!—націскаў земскі.

(Канец будзе).

Прамова пас. Гаурыліка

пры абгаварваньні бюджэту Міністэрства Зямельных Рэформау.

Маю агранічаны час. Мушу толькі коратка дакрануцца бюджэту Міністэрства Зямельных Рэформаў. Наш пагляд, як прадстаўнікоў працоўнага народу, на бюджэт Міністэрства Зямельных Рэформаў і на справу зямельнай рэформы—пагляд просты, пагляд сялянскі. Селяніну патрэбна зямля, як яго варстат працы. Гэтая зямля ляжыць у вялікіх кавалках, абрабляецца яго рукамі, але ён не карыстаецца прадуктамі сваей працы. Пэўна, ўсе памятаеце біблійны выраз—„у поце твайго твару будзеш есьці твой хлеб“. (Вясёласьць. Галасы. І гэта праўда). Аднак, паны, мы ў поце твару працуем на зямлі на хлеб, а хто гэты хлеб есьць? (Голас. І пан есьць, і я ем). Добра, але я працаваў на гэтай зямлі (Голас. І я такжа).

Пас. Гаўрылік. А пан Радзівіл — ці працаваў? . . . . . .

Вы падзялілі грамадзянства на 2 часткі: адна блакітнай крыві, другая чырвонай, адна белай косьці, а другая чорнай.

Пас. Дыборскі (НД) А якія валасы? (другі голас—лысы).

Пас. Гаўр. Пане пасол, тут ходзіць не аб валасох, але аб умысьле, розуме і сумленьні. Вы натварылі розных тэорыяў уласнасьці. Вось-жа гэтыя тэорыі далі магчымасьць маючай клясе блакітнай крыві і белай косьці нічога не рабіць, вясьці жыцьцё у роскашы (збытках) і вымыслах, а другой частцы грамадзянства працаваць ад раніцы да вечара і за гэта нічога ня мець, толькі нядолю і нявольніцтва.

(Голас: і чорныя косьці). Я патомак нявольнікаў і гэтага ня стыдаюся. Я ганаруся, што, будучы такім, проці вашай волі стаў на гэтай трыбуне, ня гледзячы на тэрор і тыя перашкоды, якія вы стаўлялі нам, прадстаўнікам працоўных масаў. (Галасы. Пана тут вельмі міла бачыць, слухаем пана з увагаю). Паставіла мяне тут ня Ваша частка, але сіла гэтых нявольнікаў, абуджаных да жыцьця і гэтая сіла, што нас сюды прыслала, дасьць сялянам зямлю, якой яны смагнуць, якой хочуць, на якой працуюць, але з пладоў якой карыстаеце вы. Пан Радзівіл сказаў учора сваю прыгожую прамову, як прадстаўнік гэтага чудатворнага беспартыйнага блёку (вясёласьць). Галоўная думка яго прамовы была тая, што абшарнікі, польскія магнаты самі зробяць зямельную рэформу, самі зробяць тое, чаго смагне працоўны народ. (Розныя галасы) Вось-жа, хоць шкада часу (вясёласьць), выбачайце, вы маеце 15 гадзін, а я маю толькі 15 мінут на цэлы бюджэт і прашу не перашкаджаць мне.

Пас. Гаўрылік. Хаця шкада часу, аднак дам тут характарыстычны прыклад вашай сумленнасьці. Гэта ваш калега, п. Гэчэвіч з Вязыні, Вялейскага павету, уласьнік вялікіх абшараў, даў сваей мамцы дзесяціну зямлі за тое, што паіла яго ўласным малаком, а калі па яе сьмерці дзесяціна перайшла яе сыну, п. Гэчэвіч, па 20 гадох уладаньня тою зямлёю гэтым чалавекам, адабраў гэтую дзесяціну ад свайго малочнага брата.

Вось як выглядае панская ласка. Чаго спадзявацца можам і мы ад вас, слухаючы сказаных учора слоў? Ня верым у вашу ласку!

Зямля нам патрэбна, зямлю возьмем самі.

Паны! Тут, натуральна, большасьць пасloў з Польшчы, (і) гледзячы на Сойм, атрымліваецца ўражаньне, што ў Польшчы ўсё добра, усё ў парадку, шчасьліва. Што ёсьць разьвіцьцё і што нічога не пагражае. Кажучы так, выходзіце з таго грунту, што становішча групаў у Сойме адпавядае становішчу розных клясаў грамадзянсава ў краі. Але гэта зусім ня так. Возьмем пад увагу хоць-бы тое, што робіцца ў нас у Зах. Белар. Прыхаджу сюды, як Беларус, каб сказаць вам праўду ў вочы. Паны прыпамінаеце мне тую біблійную вячэру, Валегасара, які быў горды са свайго шчасьця і славы ў часе, калі таемнічая рука пісала: Mane-tekel-fares. Гаворыцца тут аб зямельнай рэформе. (Гол. нарэшце).

Калі-б навет суму, якая знаходзіцца ў бюджэце, павялічыць у 2, 3 разы, то яна ня выстарчыць на правядзеньне рэформы так, як яна павінна быць праведзена. А і тых грошай, асыгнаваных у дзяржаўным бюджэце на зямельную рэформу, шкода. Так, як праводзіцца гэтая рэформа, лічу, што яе няма.

Ці гэта можа быць зямельная рэформа, калі гэтая зямля пераходзіць з рук непрацуючых, таксама ў рукі непрацуючых, што робіцца пры асадніцтве.

Нашу родную зямлю, якую мы сотні гадоў палівалі сваім потам і кроўю, атрымліваюць асаднікі, (і) каб гэта хаця былі працоўныя, але палкоўнікі, генаралы, адвакаты, дактары і часам вучыцялі.

Я сам вучыцель і знаю, што вучыцель ня мае часу араць зямлю (вясёласьць, голас, чаму пан вучыць). Знаю калегу паляка вучыцеля, які служыў у польскіх легіёнах і каторы дастаў 40 дзесяцін царкоўнай зямлі. Цяпер ён працуе ў школе за 80 вёрст ад гэтай зямлі і ані разу ў яе бок ня гляне, аддаў яе ў арэнду сялянам і бярэ цяпер прадукты толькі чужой працы, дзе тут рацыя, дзе тут логіка? (Голас на лавах Б.Б. А ці пан не дастаў зямлі пры падзеле).

Пас. Гаўрылік. Яшчэ не дастаў, але дастану, толькі не ад пана.

Ці можа быць зямельная рэформа, калі зямля парцэлюецца і аддаецца не беднаце, не беззямельным беларусам, але палякам, і то такім, каторыя ўжо маюць даволі.

Так у нас робіцца. Ці можа быць гэтая акцыя названа зямельнай рэформай, калі яшчэ скасоўваюцца сэрвітуты?...

Возьмем прыклад. Вёска, сяляне якой маюць ад $1^1/_2$ да 4 дзесяцін зямлі, а толькі малы працэнт мае ад 8 да 10 і мае сэрвітутную пашу. Гэты сэрвітут адбіраецца ад вёскі. Калі селянін мог пасьвіць сваё быдла толькі на сэрвітуце, як сэрвітут у яго адбяруць, то селянін мусіць, або прадаць карову, або зарэзаць. Ёсьць тут скарга вёскі Беніцкай воласьці, Ашмянскага павету, якая знаходзіцца якраз у такім палажэньні. Ёсьць там пан Сьвентожэцкі і вёска мела сэрвітут. Больш за 100 гадоў карысталася гэтым сэрвітутам. Аднак, гэты пан найшоў у праўнай казуістыцы якісь кручок, каб адабраць ад вёскі сэрвітут. І адабраў.

Сяляне йдуць да яго: „ласкавы пане, прадай нам гэты кусок зямлі; ня маем дзе пасьвіць быдла“. Не прадаў. Калі сяляне падалі жалабу земскаму камісару, той сказаў: Калі будзеце пасьвіць быдла на пашы—буду штрафаваць. Гэта ня толькі фраза, гэта вочавідны факт, што сяляне пачалі в роспачы рэзаць кароў, бо ня мелі дзе іх пасьвіць. Вы пазбаўляеце сялянскіх дзяцей астатняй каплі малака і яшчэ сьмяецеся.

Ці можна назваць зямельнай рэформай тое, што вёска камасуецца, ня маючы зямлі збоку? Бо-ж большасьць сялян сядзіць на $1^1/_2$, 2, 3 дзесяцінах зямлі і могуць неяк жыць толькі тады, калі будзе пасьвіць быдла толькі на супольнай пашы. Калі-ж праводзіцца камасацыя, то прападаюць супольныя пашы.

Селянін астаецца пры сваіх 2—3 дзесяцінах і ня можа ані вясьці сваю гаспадарку, ані гадаваць быдла. Маем дужа матар'ялаў скаргаў, каторыя прысылаюць нам сяляне, просячы абараняць іх, але што мы можама зрабіць пры вашых урадах. Дзіўлюся, што не жадаеце цяпер ад мяне статыстыкі. Звычайна кажаце: Апірайся, пан, на статыстыку.

Паны, калі гэтая голая праўда ў сваёй агіднай нагаце, для вас нявідзіма, калі вы ў гэтай квэстыі патрабуеце статыстыкі (голас, ніхто не жадае), але папярэдня вы жадалі, то можаце сцьвярдзіць толькі адно што вы ня знаеце жыцьця вёскі і ня маеце права называцца прадстаўнікамі працоўнага народу. (Пас. Гаўрылік паказвае пісьмы). Во скаргі, бачыце?

Гэта не камуністычная бібула, гэта крывавыя сьлёзы смутнай запраўднасьці. Мы прышлі сюды ня дзеля таго, як вы кажаце, каб спаўняць загады Масквы, мы прышлі сюды, каб споўніць найсьвяцейшы тэстамэнт сваіх продкаў, наказ нашых братоў, — каб бараніць нашу незалежнасьць і бараніць наша грамадзкае і клясавае вызваленьне. Папераджаю паноў, што Беларускі Народ даведзены да астатняй ступені нецярплівасьці. Ён патрабуе зямлі. Ён хоча гэтай зямлі і гэтага хаценьня, гэтай патрэбы, ня зможаце ў яго адабраць. (Голас: мы ня хочам адабраць). Ён чакае. Учора Радзівіл выказаў прыгожыя фразы, але ня прыгожыя ўчынкі. Кажаце, што любіце Польшчу, што жадаеце ёй шчасьця, што даеце ўчынкі, даеце селяніну зямлю, але зямлю з выкупам.

За што вам плаціць грошы? За тое, што да гэтага часу вы карысталіся з гэтай зямлі? Ня вам належацца грошы, але ад вас належацца грошы народу.

Калі не дасьцё зямлі, то гэтая зямля будзе ўзята самымі сялянамі.

Яшчэ скажу некалькі слоў аб лясох. Маеце бясплатныя жалезнадарожныя праезды, пэўне бачыце, як усе станцыі завалены дзеравам. Лес вязецца заграніцу, а наш селянін ня мае ані воднага пня паправіць хату, ня мае ані аднаго калка на агароджаньне. Гэты лес эксплёатуецца купцамі і абшарнікамі. Народны скарб аддаецца ў рукі прыватнай эксплёатацыі. Гэта-ж скандал! Пан міністар сказаў, што экспорт лесу ўжо зьменшыўся. Нічога дзіўнага, бо-ж лес не расьце так, як грыбы. Яго ўжо няма. Дык нічога дзіўнага, што экспорт лесу зьменшыўся. Яго ўжо няма і незадоўга будзем мець голыя высекі там, дзе калісь былі лясы.

Паны заўсёды кідаеце нам абвіненьне, што ў беларускім народзе пашыраецца камуністычная агітацыя, шырацца бальшавіцкія настроі. (Голас: не, гэтага ня кажам). Я скажу, што не Масква пашырае бальшавіцкія настроі, а вы, бо вы даводзіце народ да галадовага становішча, да становішча роспачы. (Голас на лавах ППС. У Беларусі няма камуністаў).

Пас. Гаўрылік. Тут голасна гаварылі фразы, што Польшча разьвіваецца, што ёсьць на вельмі добрай дарозе да дабрабыту і шчасьця ў будучыні. Але я вам кажу, што ў гэтым лакаматыве, які гоніць Польшчу наперад, паравы кацёл напружаны да апошняй магчымасьці, а кляпа зачынена. Зямельная рэформа гэта той камень, аб які Польшча спаткнецца. Выразна і ясна здаеце сабе справу, што зямельная рэформа ёсьць квэстыя, якую ня зможаце разьвязаць. Вы ўважаеце, што лепей заплюшчыць вочы і не глядзець на гэта. Тое, што вы цяпер робіце, гэта якраз і ёсьць заплюшчваньне вачэй на запраўднасьць. Тут зусім таксама стаіць справа, як і пры зачыненым катле. Кажаце, хай будзе зачынены яшчэ колькі мінют і баіцеся прыступіцца да яго, каб адчыніць яго кляпу. Але паны, гэты кацёл выбухне і тады будзе катастрофа. У Беларусі ёсьць беларусы, яны так-жа хочуць жыць, хочуць есьці і хочуць мець страху над галавою. Калі-ж яны гэтага ня маюць, калі-ж ім гэта адмаўляюць,—яны йдуць браць самі і возьмуць.

Да польска-літоускага спору у Лізе Нацыяу.

Вальдэмарас — здаволены ходам справы ў Лізе.

Ня гледзячы на ўсе вострыя, часам балючыя для амбіцыі, удары, атрыманыя Вальдэмарасам на апошняй сэсіі Рады ў часе разгляду польска-літоўскага спору, Вальдэмарас — здаволены агульным ходам ды рэзультатам расправы ў Жэнэве, як ён заявіў гэта ў „гутарцы“ ў аднэй з бэрлінскіх газэтаў.

Дрэннае палажэньне Літвы ў Жэнэве ня было неспадзяванкай для яе ўраду, казаў ён. Некаторыя вялікія дзяржавы стараюцца націснуць на Літву, каб яна зьмяніла сваё становішча ў справе, якую літоўскі народ лічыць прынцыповай. Але-ж гэта — немагчыма і дарэмна: Ад сваіх прынцыповых імкненьняў Літва не адступіць за ніякую цану. Далей Вальдэмарас сільна крытыкаваў даклад галяндзкага дэлегата, дакладчыка Рады, — за яго староннасьць ды несправядлівасьць на крыўду Літвы. Дакладчык, напрыклад, не азначыў зусім пэўных рэзультатаў польска-літоўскіх перагавораў, асягнутых камісіяй працаваўшай у Бэрліне, — у справе праз-гранічнага руху..

Што датычыць абвяшчэньня Вільні сталіцай Літвы ў новай канстытуцыі апошняй, дык у гэтым няма нічога новага. Вільня — гістарычная сталіца Літвы дый была ўжо абвешчана такой — у першым акце аб незалежнасьці Літвы ў 1918 г. Гэтага ніколі ў ніякім акце не выракалася Літва.

Вальдэмарас спадзяецца, што на верасьнявай сэсіі Рады Лігі справа польска-літоўскага спору выкліча яшчэ больш гвалтоўную спрэчку...

У канцы Вальдэмарас дадаў, што, ня гледзячы на ўсе гэтыя засьцярогі, літоўскі ўрад будзе надалей вясьці перагаворы з Польшчай, шукаючы практычнага выхаду з палажэньня.

Падпісаньне літоўска-нямецкага гандлёвага трактату.

Газэты паведамілі, быццам адказам на паражэньне ў Лізе Літвы мае быць з боку Нямеччыны — хуткае падпісаньне гандлёвага трактату з Літвой.

Французская і англійская прэса лае Вальдэмараса.

Французская прэса, амаль што бяз розьніцы кірункаў, перабрала ўсякую меру ў лаянках на Вальдэмараса. У аднэй з нацыяналістычных газэтаў ведамы публіцыст піша, што „Вальдэмарас—залішне малы, каб варта было навет пхнуць нагой, хаця ён добра заслужыў гэта“. Польская прэса з смакам цытуе гэтыя праявы нячуванага раней хамства паваеннай прэсы ў „цывілізаваных“ краёх.

Англійская прэса лаецца „больш прызваіта“. „Ліга ня можа ўжо надалей бараніць Вальдэмараса проці наступстваў яго-ж шалёнай палітыкі“, піша адна з газэт. „Вальдэмарас — пагроза эўрапэйскаму міру“, піша другая. „Сьвету надаеў ужо дарэшты Вальдэмарас і яго вар'яцкая палітыка“, піша трэцяя.

Можа варта прыпомніць, што ня менш востра і някультурна лаялася заграгічная прэса ў 1920 — 1921 г. г. — пасьля замаху ген. Жэлігоўскага, бароначы правы Літвы на Віленшчыну...

Хатняя вайна у Кітаі.

Чанг-Кай-Шэк астаецца на папярэднім становішчы.

На заяву Чанг-Кай-Шэка аб адстаўцы Нанкінскі ўрад адказаў адмовай. Такім чынам пакуль-што Чанг-Кай-Шэк астаецца старшынёй Палітычнай Рады (ўраду?), захоўваючы кіруючы ўплыў на палітыку новай кітайскай улады.

Ці памёр, ці жыве Чанг-Тсо-Лін?

Адны тэлеграмы з Кітаю падробязна апісваюць урачыстыя хаўтуры былога дыктатара паловы Кітаю Чанг-Тсо-Ліна, тады як другія—падаюць апошні загад яго па арміі, у якой ён цьвердзіць, што рана яго — зусім не такая цяжкая, як гэтага хацелася-б пэўне яго ворагам дый як аб гэтым крычыць, хаваючы яго жывым у зямлю, варожая яму прэса. Ён кажа, што хутка будзе здароў ды ізноў стане на чале сваей „пераможнай арміі“, заклікаючы цяпер усіх спаўняць свае абавязкі. Загад прачытаны быў па ўсім фроньце. Што загад—пісаны Чанг-Тсо-Лінам, гэта можа быць, але толькі вось — калі? — Пэўне-ж—перад сьмерцю!..

Ці паб'юцца пераможцы - генэралы?

З Пэкіну ідуць трывожныя весткі — аб тым, быццам паміж трыма генаралам, якія маюць найвялікшыя сілы і ўплывы ў нацыянальна-аб'яднаным Кітаі, пачаліся спрэчкі за вышэйшую ўладу. Генэрал Іен, якога войска першым увайшло ў Пэкін дый узяло Цянь-Дзінь, назначыў сам сябе губэрнатарам гэтых занятых местаў і правінцыяў, нарушаючы гэтым загады свайго вышэйшага камандзіра ген. Фэнга. Гэта выклікала востры канфлікт паміж імі. Трэцім канкурэнтам зьяўляецца, як ведама, ген. Чан-Кай-Шэк, які валадае ўсім паўдзённым Кітаем дый мае найлепшы адміністрацыйны апарат, дый найляпей надаецца на цывільнага дыктатара краю, — пакуль вядзецца яшчэ барацьба за вызваленьне. Ці не праваляць — ізноў генэралы-пераможцы ўсей народнай справы сваей узаемнай грызьнёй за ўладу, — на радасьць ворагам вызваляючагася народу.

Заява ген. Іена паслом загран. дзяржаваў.

Ген. Іен запрасіў да сябе 13. VI. пасloў усіх вялікіх дзяржаваў у Пэкіне і заявіў ім, што адгэтуль бярэ на сябе адказнасьць за ахову жыцьця і інтарэсаў усіх чужаземцаў у Пэкіне, заверыўшы іх, што новая кітайская ўлада цалком апанавала палажэньне.

Бомбавы тэрор у Мукдэне.

З Мукдэна даносяць, што ў месьце шалее запраўдны бомбавы тэрор, скіраваны проці японскіх установаў. Выбухі бомбаў быццам ня выклікалі ахвяраў, але шмат японцаў ды кітайскіх паліцыянтаў—японскіх наймітаў — пакінулі Мукдэн, уцякаючы ў больш бясьпечнае месца.

Японія ня спыняе правакацыяў.

Генэральны консул Японіі ў Тсінг-Тао заявіў кітайскаму губэрнатару правінцыі Шантунг, што — да часу поўнага ўрэгуляваньня выпадкаў у Тсі-Нан-Фу, што працягнецца некалькі месяцаў, Японія не дапусьціць у раёне чыгункавых лініяў Шантунгу, занятых японскімі атрадамі — ані кітайскіх войскаў ані навет кітайскіх (новай улады) сьцягаў над гмахамі дзяржаўных установаў краю.

Кітайскае пасольства ў Токіо заявіла японскаму міністру загран. спраў, што адгэтуль вывешвае на сваім гмаху сьцяг нацыянальнага ўраду. Японскі міністар адказаў, што японскі ўрад ня мае проці гэтага нічога, толькі гэта зусім не азначае, што Японія прызнала ўжо гэты новы ўрад.

„Перамога Расеі ў Кітаі“.

Як радавая, таксама і заграгічная прэса сцьвярджаюць, што апошні паварот кітайскіх падзей зьяўляецца ў значнай меры трыумфам савецкіх уплываў у Кітаі. Бо-ж, як ведама, перамогу паўдзённых арміяў над Чанг-Тсо Лінам вырашыла армія ген. Фэнга. А гэты Фэнг апіраецца на мангольскую армію, якая ў значнай меры створана дапамогай СССР. Прэса сцьвярджае, што новы зварот у Кітаі ў значнай меры вызваляе Кітай з-пад „нявіднай акупацыі“ Японіі і Англіі, уцягваючы яго ў сфэру савецкіх уплываў.

Палітычная хроніка.

У Польшчы.

З рэгулямінавай камісіі.

15 г. месяца Соймавая рэгулямінавая камісія нараджалася над справай судовай расправы проці пасloў. Па нарадах аднагалосна пастаноўлена зажадаць устрыманьня судовай расправы проці пасloў: Сасінскага (гр. Карфантага), Вітаса (Пяст), Дубовіка (ППС), Ледахова і Гмары (Str. Chł.).

Устрыманьне-ж судовай расправы проці бел. пасloў Стагановіча і Грэцкага камісія адкінула большасьцю галасоў, пакідаючы ў гэтай справе голас (вырашэньне) старшыні Сойму.

Цікава, што проці ўстрыманьня галасавалі вызваленцы і сялянская партыя (stronnictwo chłopskoe), якія так пруцца на нашы землі. Да характарыстыкі гэтых партыяў трэба дадаць, што гэта найбольшыя прапагатары ідэі колёнізацыі нашых земляў. Разам з пэпээсамі — зусім добры букет, які носіць назоў—„лявіцы“!

Лік безработных у Верхнім-Сьлёнску.

„Rzplita“ ў 164 нумары падае — ваяводзкі камунікат, па якім на абшарах Сьлёнскага ваяводзтва знаходзіцца 38.781 безработных. З гэтага ліку на гарнякоў выпадае 13.856 безработных, на губніства 2.202 безработных, на прамыслы: мэталёвы 2.035, будаўляны 1.754 безработных і г. д. Маючых права атрымліваць запамогі было 15,820 безработных.

Саранча ў Польшчы.

Газэты падаюць, што над Наклам (Памор'е) праляцела хмара саранчы, кіруючыся на ўсход. Шкоды саранча не зрабіла ніякай.

Будаўляная забастоўка ў Кракаве.

Як падае „Dz. Wil.“ № 130, будаўляная забастоўка ў Кракаве, трываючая больш 10 дзён, абхапіла 6.000 работнікаў. Забастовачная сітуацыя ў апошнія дні завастраецца. Ад 11 г. месяца пачнецца забастоўка ў-ва ўсіх аддзелах прафэсыянальнага саюзу будаўляных работнікаў. Жаданьні будаўляных работ-

тнікаў падтрымаюць кафлярскія, малярскія, каменярскія і штукатурскія работнікі.

Апрача Кракава, забастоўка абымае Скавіну і Бежанаў.

Заграніцай.

Скандалы і бойкі ў Прускім Сойме.

На адчыненьні Прускага Сойму адбыліся бурныя скандалы і бойкі паміж хрысьціянска-сялянскай партыяй і камуністамі. Сільна пабіты пасол з першай Пояфідке вынесены ў бальніцу. Чым былі выкліканы авантуры, з тэлеграмаў ня відаць. Пасьля залагоджаньня скандалу камуністы пастанавілі дамагацца амністыі палітыч. вязьням. Прапазіцыя аб амністыі прынята Соймам—дзякуючы падтрыманьню сацыялістаў і часткі цэнтру.

Экспозэ Прускага ўраду адкладзена на наступнае пасяджэньне. Відаць — з гэтага і пачалася авантура, што камуністы трэбавалі сьпярша прыняць пастанову аб амністыі, а пасьля ўжо слухаць экспозэ ўраду. Урад пастанавіў не дамагацца фармальнага выражэньня даверра з боку Сойму, лічучы, што даверра выражана ўжо выбарамі, даўшымі ўраду значную большасьць галасоў.

Камуніст у прэзыдыуме Прускага Сойму.

Старшынёй Прускага Сойму выбраны сацыяліст Вартэльс. Адным з 3 віцэ-старшыняў выбраны камуніст Швэнк.

Радавая прэса—аб небясьпецы вайны ў Эўропе.

Радавая прэса ўсьцяж зьвяртае ўвагу працоўных масаў усяго сьвету на няспыняючуюся небясьпеку вайны ў Эўропе. Вайна не толькі рыхтуецца процi Радаў, але можа, дзякуючы міжнароднай канкурэнцыі імпэрыялістычных дзяржаваў, выбухнуць шмат дзе ў Эўропе. Адным з такіх сталых вогнішчаў ваеннай заразы радавая прэса слушна лічыць Балканы. Італія сваей палітыкай лёгка можа запаліць на Балканах пажар, які няменш лёгка перакінецца на ўсю Эўропу — бо-ж за Югаславіяй і Італіяй і рэшта дзяржаваў Эўропы пахаваліся на варожыя лягеры. Асабліва радавая прэса дае ангельскую дыпляматыю, якая, падтрымліваючы правакацыйную палітыку Італіі на Балканах, імкнецца да сваіх уласных мэтаў. Палітыку Англіі на Балканах радавая прэса лічыць „міратворчай", але гэта — толькі дзеля таго, каб, залагодзіўшы канфлікты дзьве супярэчнасьці паміж усімі буржуазнымі дзяржавамі Заходу, тым лягчэй было-б аб'яднаць іх усіх — у супольны ваенны і ўсякай іншай акцыі процi Радавага Саюзу. Саюз Англіі з Італіяй у гэтай мэце радавая прэса лічыць дзеля таго найвялікшай небясьпекай для эўрапэйскага міру.

Радавая газэта—аб падарожжы румынскіх генералаў у Польшчу.

„Рабочая Газэта" інфармуе, быццам румынскія генералы прыехалі ў Варшаву, каб абгаварыць разам з польскім Генеральным Штабам плян супольнага наступленьня Польшчы і Румыніі на Радавую Украіну.

„Усіленьне процi-польскіх настрояў у ССРР".

Пад такім загалоўкам польскія газэты падаюць:

З Масквы даносяць аб процi-польскіх выступленьнях радавай прэсы.

„Правда" піша, што „ў Польшчы відаць у апошнім часе ўзрост зачэпных няпрыхільных настрояў адносна да ССРР". Часопісь гэтая вылічае факты, якія быццам сьцьвярджаюць гэтае абвіненьне. Прэса пазываецца на артыкулы выдатнага польскага дыплямата, пішучага пад псэўданімам Спэктатар, на выступленьні мін. Залескага (ў соймавай камісіі) і заявы дырэктара Усходн. Дэпартамэнту Мін. Загран. Спраў п. Голувкі.

„Узрост варожых настрояў у Польшчы, кажа „Правда", ня можна не ўзлажыць на бязупынныя высілкі ангельскага імпэрыялізму ў кірунку стварэньня процi-радавага блёку. Таемная падарожжа генерала Канажэўскага, прыезд румынскай ваеннай дэлегацыі ў Варшаву, усё гэта — этапы гэтай вельмі небясьпечнай для міру гульні". У канцы „Правда" выражае нездаволеньне апошняй нотай пасла Патка, асабліва за яго крытыку неадказнага тону радавай прэсы".

Так даносіць польская прэса. Але з гэтай заметкі відаць хутчэй — нездаволеньне радавай прэсы з прычыны таго „ўзросту процi-радавых настрояў", якое—правільна ці не—угледжвае радавая прэса ў Польшчы.

Замах на японскага прэм'ера.

Ангельскае агенства даносіць з Токіо—аб замаху на японскага прэм'ера. Быццам 7 чэрвеня раніцай, калі прэм'ер прыехаў на вагзал, каб паехаць на канфэрэнцыю сваей партыі, на яго, як маланка, кінуўся чалавек у вопратцы работніка ды замахнуўся кінжалам. Аднак-жа паліцэйская ахова здолела стрымаць удар, уратаваўшы жыцьцё прэм'ера. Замахоўца арыштаваны. Падробнасьцяў пакуль-што няма.

Гувэр—кандыдатам на прэзыдэнта Амэрыкі.

На кангрэсах рэспубліканскай партыі паасобных штатаў Амэрыкі амаль ня ўсюдых значную большасьць здабывае кандыдатура Гувэра, мін. гандлю і прамысловасьці ў сучасным амэрыканскім ўрадзе. Гувэр, ведамы арганізатар амэрыканскай пажыўнай дапамогі ў часе страшэннага голаду ў ССРР, а асабліва стаўшы папулярным у Амэрыцы за яго гэраічныя высілкі ў справе зьліквідаваньня вынікаў вялізарнай катастрофы ў краі — у зьвязку з нябывалымі паводкамі, прарывамі вялізарных грэбляў і г. д.

Кулідж, сучасны прэзыдэнт, прыслаў партыйнаму кангрэсу Нью-Іорку тэлеграму, што рашуча і канчальна зьнімае кандыдатуру, навет калі-б быў выбраны аднагалосна.

тнікаў далучыцца да бастуючых з пачуцьця работніцкай салідарнасьці.

У Васількове фабрыкі ўжо бастуюць. На вечы ў Беластоку праваднікі бастуючых заклікалі работнікаў, каб яны не згаджаліся на такую падвышку, як Лодзкія работнікі, а засталіся пры жаданьні 30 і 40 прац. падбаўкі.

Інспэктар Працы заклікаў да сябе прадстаўнікоў бастуючых і працадаўцаў, дзеля неафіцыяльнага паінфармаваньня іх, аб магчымасьці зьліквідаваньня забастоўкі, але работнікі асталіся пры сваім жаданьні, а прамыслоўцы адмовіліся ад перагавораў з работнікамі, аж пакуль яны ня пойдуць працаваць.

У ткацкіх варштатах на Чэнстахоўскай вуліцы была малая бойка паміж працуючымі там работнікамі і 150 бастуючымі, прышоўшымі дамагацца ад іх забастоўкі.

Ня гледзячы на розныя перашкоды, забастоўка наагул, чым далей, тым больш, пашыраецца. А тое, што абедзьве стараны знаходзяцца на няўступлівым становішчы, не дае надзеі спадзявацца хуткай перамогі якога небудзь боку.

Дык хто-ж пераможа — ці працоўныя работнікі, ці вызасківаючая іх працу буржуазія?

Палітычнае забойства ў Горадні. На Віленскай вуліцы ў Горадні, няведама кім, застрэлены жыхар вёскі Лігаўкі, Герасім Мірук. Забойца ўцек пад Нёман, дзе схаваўся. Уцякаючы забойца тры разы выстраліў у гонячагася за ім паліцыянта, які таксама страляў у яго, але стрэлы іх ня далі ніякога скутку. Наладжаная потым паліцэйская аблава, ня дала ніякага выніку. Прыпускаюць, што прычынай забойства былі партыйныя парахункі.

З Т-ва Бел. Школы.

Акружная Управа Т-ва Белар. Школы ў Вялейцы.

Маючы замер пашырыць культурна-асьветную працу за помачу сыстэматычнага чытаньня лекцыяў і ладжаньня вячэрніх чытанак і дэклямацыі вершаў па гуртках Т-ва, зьвяртаецца да ўсіх сьведамых Беларусаў свайго вокругу, могучых працаваць у гэтай галіне, з заклікам уступіць у сябры рэфэратнае сэкцыі, арганізаванай пры Акружной Управе і прыняць удзел у працы. Лекцыі могуць пісацца, за выняткам тэм палітычных, усебаковага зьместу (па гісторыі, геаграфіі, літэратуры, гісторыі адраджэньня, гаспадарцы і агульна-узгадаваўчыя). Напісаная лекцыя павінна быць прыслана ў Акружную Управу, якая яе апрабуе ў Старостве, а затым, адбіўшы на шапірографе, разашле па ўсім гурткам Т-ва. Дзеля прачытаньня лекцыі, ладжаньня чытанак і дэклямацыі вершаў, кожны гурток Т-ва мусіць знайсьці адпаведнага лектара, які-б мог прачытаўшы лекцыю, вытлумачыць незразумелае для слухачоў. З заявамі аб згодзе быць сябрам рэфэратнае сэкцыі зварачвайцеся ў акружную Управу. (Wilejka pow., Dąb-Biernackiego 2).

Акружная Управа.

Падзяка.

Мішуцкі Гурток Т-ва Белар. Школы гэтым складае шчырую падзяку ніжэйпамянутым грамадзянам, за зложаную імі ахвяру на карысьць бібліятэкі, чытальні пры гуртку Т-ва: Васіль Кабак — 3 зл., Сымон Купавіч—5 зл., Зьмітра Купавіч—1 зл. 50 гр., Павал Кабак с. Аляксандра — 1 зл., Юстын Купавіч — 1 зл., Павал Кабак с. Мікалая — 1 зл., Вінцук Шайка—1 зл., Янка Шайка — 1 зл., Янка Купавіч—50 гр., Аляксандра Аксіновіч—50 гр., Аляксей Шабунька — 50 гр., Фр. Вайцюль—25 гр., Уладз. Купавіч — 25 гр., Янка Шайка—25 гр., Янка Кабак—70 гр.

Разам—17 зл. 45 гр.

× Асабліва шчырую падзяку складае гурток грам. Сымону Купавічу з в. Мішут, Вайстамскае вол., за ахвяраваньне ім на карысьць бібліятэкі-чытальні, існуючай пры Гуртку, наступных кніжак: 7 нумароў гаспадарчай часопісі „Саха", Беларускі Народны календар на 1927 г., камплект часопісі „Маланка" за 1927 г. у сшытку і 6 кніжак у польскай мове, гаспадарчага зьместу.

Так-жа складаецца, шчырая падзяка грам. Паўлу Кабаку з тэй-жа вёскі, за ахвяраваную ім, на карысьць тэй-жа бібліятэкі, кніжку „Зборнік беларускіх ведамасьцяў".

Хай гэты добры прыклад, будзе прыкладам і для другіх грамадзян нашай ваколіцы.

Абвестка.

Гэтым падаецца да агульнага ведама, што сяброўскі білет Т-ва Беларускае Школы № 7789, выданы на імя Анайніча Пётры з в. Жданы, Пастаўскага пав., уневажняецца.

Галоўная Управа
Т-ва Белар. Школы.

Карэспандэнцыі.

З жыцьця нашай моладзі.

(Вёска Бадзені, Пастаўскага павету).

15 мая ў нас была вечарына. Сабраўшыяся хлапцы напіліся гарэлкі, і пачалі лаяцца ды біцца.

Адкуль-жа гэта ў вас, браткі, на гэтую агідную „працу" і на гарэлку хапае розуму і грошай? Калі-ж аднаго разу мы сталі гукаць, каб зложыць некалькі грошай і выпісаць родную газэтку, дык хлопцы адказалі: „Лепш мы за гэтыя грошы пойдзем да Маркі і там нагуляемся ў карты і будзем мець лепшую карысьць, чым ад гэтай газэты"!

Вось якая „мудрасьць"!

Дык, браточкі вы мае даражэнькія, кіньце вы гэтую агідную „працу", а лепш вазьмеце ды пачытайце што-небудзь для сябе і для расказу другім.

Вясковы.

Новыя (санаторскія) мэтады лячэньня.

Марыя Кузьміч, сялянка з вёскі Дварэц, Кажангарадзецкай гміны, Лунінецкага павету, лежачы хворая ў павятовым госпітале, лунінецкага сойміку ад 12 да 17 траўня, а першай гадзіне ўночы з 15 на 16 траўня была сьведкай наступнага:

Хворы з суседняга пакою праз калідор, у гарачцы падняў крык; сядзелка загадала яго супакоіць. Не памагло! Тады сядзелка паклікала дыжурную фэльчарыцу, (ці сястру?) якая ўбегшы, адразу пачала біць хворага ключом па галаве, разьбіла галаву так, што з беднага пачала ліцца кроў. Хворы не біўся і не бараніўся, а толькі крычаў; тады падскочыў сторож, прозьвішча якога Кулак, і, б'ючы паленам хворага па галаве, памог фэльчарыцы яго супакоіць. Яна бачыла ўсё гэта сваімі вачыма, стоячы ў расчыненых дзьвярох, баючыся пікнуць, каб яе не забілі і толькі на наступны дзень расказала гэта іншым хворым.

Званар.

Наша хроніка.

Прыезд грам. Гарэцкага. Як падае „Kur. Wil." у № 133, у Вільню маецца прыехаць вядомы беларускі дзеяч і паэт Максім Гарэцкі, які ў свой час быў выселены польскімі ўладамі ў Літву, а адтуль праз Латвію, дзе выкладаў на курсах беларусазнаўства гісторыю бел. літэратуры — у Рад. Беларусь.

Звальненьне з турмы гр. У. Павалковіча. Надовячы звольнены з турмы рэдактар час. „Сахі" — гр. У. Павалковіч, відаць за бракам абцяжаючых матар'ялаў. У. П. прасядзеў у турме на Лукішках каля чатырох месяцаў і страшэнна падупаў на здароўі, так што патрабуе ўжо зусім іншага адпачынку.

Звальненьне П. Крынчыка. Як паведамляюць, гэтымі днямі звольнены з Слонімскага вастрогу кандыдат на пасла з акружнага сьпіску „Змаганьне за інтарэсы сялян і работнікаў" па Навагрудчыне—Павал Крынчык, які прасядзеў у вастрозе з 29/II. па 30/V. с. г. і якога вінаваціл па 102 арт. К.К. П. Крынчык звольнены пад надзор паліцыі. А за-што дзяржалі тры месяцы?

Сьмерць каапэратара-беларуса. 9. VI. памёр ад сухотаў інструктар каапэрацыі — Лукаш Арэхва. Аддаць апошнюю павіннасьць памёршаму зьявілася лічнае беларускае грамадзянства, якое праводзіла нябожчыка на могілкі на чале з гімназіяльным аркестрам. Над магілай прамаўлялі Э. Будзька (папольску) і К. Крук (пабеларуску), якія адзначылі заслугі памёршага на полі каапэрацыі на беларускіх землях.

„Вечар славянскае песьні". У нядзелю 17 г. чэрвеня ў Салі Віл. Бел. Гімназіі адбыўся грандыёзны канцэрт-лекцыя, ці „Вечар славянскае песьні"—пад агульным кіраўніцтвам праф. Галкоўскага і гр. Р. Шырмы з удзелам п. п. Зубовічавай, Шырмавай і інш. выдатнейшых вокальных сілаў. Багатая праграма, новы рэпэртуар, асабліва што да беларускага аддзелу, дзе падана шмат новых песьняў у апрацоўцы гр. Галкоўскага, урэшце запраўды мастацкае выкананьне—зрабілі надзвычайнае ўражаньне на лічную публіку, якая не магла ўжо зьмясьціцца ў салі Гімназіі.

Большую ацэнку вечара падамо ў наступным нумары.

„Беларускі Дзень" і „Грамадзянін" — канаюць. У расейскім „Утры" з 17 г. месяца зьмешчана наступная кароценькая вестка: У найхутчэйшым часе перастаюць выходзіць „Беларускі Дзень" і „Грамадзянін". Замест іх будзе выдавацца нейкая новая беларуская часопісь. Як чутно — гэтых двох „полёнофілаў"—жэняць. Ня шкодзіла-б сюды далучыць і „слаўнага" Янку Станкевіча.

„Аб'яднаньне" праваслаўных беларусаў. „Kur. Wil. у тым-жа 133 нумары падае дужа цікавую вестку аб новым „аб'яднаньні" беларусаў. Справа ў тым, што па словах гэтай газэты, праваслаўныя беларусы робяць такую арганізацыю, якая мае злучыць усіх праваслаўных беларусаў. Далей „Kur. Wil." падае, што ініцыятары гэтай групы заклікаюць на свайго старшыню сьвяшчэньніка Каўша, рядомага ў працэсе „Грамады".

Вельмі цікава!...

Прыгавар у вялікім камуністычным працэсе 136 у Беластоку. У пачатку чэрвеня г. году Акружны Суд у Беластоку вынес прыгавар у справе вялікага камуністычнага працэсу (136) у Беластоку.

Гэтым прыгаварам засуджана, як піша „Rzeplita" № 164, 2 чалавек на 8 гадоў цяжкага вастрогу, 3 на 7 гадоў цяжкага вастрогу, 13 на 6 гадоў цяжкага вастрогу, 13 на 4 гады цяжкага вастрогу, 22 на 3 гады цяжкага вастрогу, 15 на 2 гады з паловай цяжкага вастрогу, 5 на 2 гады вастрогу і 9 на 1 год вастрогу.

26 абвінавачаных апраўдана. Усім засуджаным залічаны прэвэнцыйны арышт.

Па абвяшчэньні прыгавару, засуджаныя пачалі антыдзяржаўную дэманстрацыю са сьпевам „Інтэрнацыяналу" і рознымі „антыдзяржаўнымі" лёзунгамі.

Узрост забастоўкі ў Беластоку. Астатнія газэты падаюць, што валакняная забастоўка ў Беластоку пачынае пашырацца і на ткацкія фабрыкі, у якіх ужо бастуе больш 100 работнікаў.

Забастоўка валакняных работнікаў у Беластоку. У Беластоку ўсё яшчэ цягнецца агульная забастоўка валакняных работнікаў. Агулам бастуе 2.823 работнікі. Забастовачны камітэт работнікаў стараецца пашырыць забастоўку і на ўсе суседнія мястэчкі беластоцкага прамысловага вокругу.

У Супрасьлі адбылося работніцкае веча, на якім забастовачны камітэт заклікаў рабо-

Паштовая скрынка.

Прыяцелю. Ваша карэспандэнцыя, „Сумныя зьявішчы", да друку не падходзіць. Пішэце аб чым-небудзь іншым і больш коратка. — **Я. Няшчаснаму.** Вашы карэспандэнцыі патрабуюць шмат апрацоўкі. Старайцеся пісаць, як найкарацей. — **М. Р.** Адна з вашых карэспандэнцыяў з папраўкамі будзе зьмешчана — другая не падходзіць. — **А. Сініцы.** Што ў нашай магчымасьці—зробім.—**Праныры.** Ня можам зьмясьціць з прычынаў цэнзурных. — **Бурлаку.** Пішэце каротка і ясна. — **Я. Б., Блізкаму, Ворагу цемры, Ярашэвічу, Селяку, Я. Няшчаснаму, Г. Ч., Спутнаму, Беларусам з Лідчыны і Дубу** — скарацiўшы, зьмесцім — **В. Шкодзічу і С. Сіняку.** Вашы творы дасталі. Як вершы, гэтак і апавяданьні падаюцца да друку і будуць зьмешчаны ў нашай часопісі. — **Усім іншым.** Вельмі перапрашаем, што карэспандэнцыі ня зьмешчаны. Гэтаму перашкодзілі канфіскаты газэты.

Рэдактар-Выдавец: Ал. Рудзінскі.

Друкарня Я. Левіна, Вільня, Нямецкая 22.